УДК 808.26: 502.12:37

Г. Ф. Швед, выкладчык

# РОЛЯ ТВОРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў ЭКАЛАГІЧНЫМ ВЫХАВАННІ

Works of Belarusian literature, devoted to native nature, contribute to ecological education of a personality, man's orientation in the environment.

Удасканаленне экалагічнай адукацыі і выхавання з'яўляецца адным з вядучых напрункаў развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі. Складанасць і неардынарнасць экалагічнай сітуацыі на Беларусі пасля Чарнобыльскай катастрофы, глабальныя экалагічныя змены і новыя пагрозы жыццезабеспячэнню людзей, якія ўзніклі ў сувязі з гэтым, рэзка актуалізавалі праблему фармавання экалагічнай культуры ў беларускім грамадстве.

Паводле вынікаў рэспубліканскага сацыялагічнага апытання, увага беларускага насельніцтва да экалагічных праблем і праблем якасці жыцця цяпер даволі вялікая. Расце тэндэнцыя ўмацавання новых уяўленняў у грамадскім светапоглядзе пра ўзаемасувязь чалавека і наваколля.

Сацыяльна-экалагічныя праблемы, якія ўзніклі ў выніку Чарнобыльскай катастрофы, ставяць сёння перад адукацыйнымі структурамі задачу выхавання новай культуры сацыяльных паводзін у экасістэме.

Вялікі ўплыў на экалагічнае выхаванне аказвалі і аказваюць творы беларускіх пісьменнікаў. Чалавек і прырода… Сёння гэтая праблема, як ніколі раней, займела надзвычайную вастраню і надзённасць, набыла шматаспектны і шматварыянтны характар. Праблемы экалогіі вымагаюць ад мастакоў слова ўсёй паліфаніі ў іх вырашэнні. Прыродаапісальныя моманты ўжываліся ў мастацкай літаратуры ранейшым часам толькі як падсветка ўнутранага стану чалавека, пазней – як сродак псіхалагічнага выяўлення грамадскай свядомасці. Праблема ўзаемаадносін чалавека і прыроды – найперш пытанне высокамастацкага характару. У ранейшым рэчышчы прырода, пераважна пейзаж, – фон, на якім разгортваюцца падзеі твора. Лес. Рэчка, луг, неба…часам проста ўпрыгожваюць краявіды літаратурных палотнаў. Узаемапаразуменне персанажа з прыродай сведчыць пра духоўна багатую натуру, пра здольнасць адчуваць мудрасць жыцця, прыроды. Творы так званай экалагічнай тэматыкі б'юць у званы ад таго, што насоўваецца на чалавецтва экалагічная катастрофа. Зямля страціла ранейшую плоднасць, мялеюць рэчкі, высыхаюць лясы.

Здаецца, перад пісьменнікамі адкрываецца безліч магчымасцяў – адкрыццяў адносна сувязі «душа чалавека – апакаліпсіс натуры». І самае няпростае – не абмяжавацца, з аднаго боку, толькі знешняй канстатацыяй у многім драматычных змен стану навакольнага асяроддзя, а з другога – толькі «лямантам» непрынятця гэтых змен героямі мастацкіх твораў.

Беларускую літаратуру здаўна цікавіў свет прыроды. У паэме М. Гусоўскага «Песня пра зубра» ёсць маляўнічыя апісанні беларускай пушчы, птушак і звяроў роднага краю. Пра з'явы прыроды, паводзіны звяроў і птушак у XIX – пач. XX ст. шмат пісалі У. Сыракомля, П. Шпілеўскі, Цётка, Я. Колас. Паэму Я. Коласа «Новая зямля» можна назваць паэтычным гімнам прыродзе, паэтычным календаром прыроды, энцыклапедыяй беларускай прыроды. Яна ў паэме набывае характар асаблівага персанажа.

Цікавым узорам літаратуры аб прыродзе савецкіх часоў з'яўляецца аповесць Я. Маўра «Чалавек ідзе», у якой аўтар асвятляе далёкае мінулае чалавецтва, паказвае эвалюцыю светаўспрымання і мыслення чалавека ва ўзаемасувязі з навакольнай прыродай. У кнігах В. Вольскага «Родны край» і «Падарожжа па краіне беларусаў» багата прадстаўлены флора і фаўна беларусаў. Вялікую пазнавальную каштоўнасць маюць аповесць У. Дубоўкі «Жоўтая акацыя» і «Ганна Алелька» праператварэнне прыроды і дзейнасць юных натуралістаў.

Варта адзначыць, што з усіх прыродных кампанентаў, бадай, найбольш характэрным для Беларусі з'яўляецца лес. Ён знайшоў шырокае адлюстраванне ў шматлікіх прыкладах вуснай народнай твлорчасці, у беларускай літаратуры. «Мабыць, галоўныя адрозненні ў псіхіцы беларусаў і жыхароў мясціны, дзе мала лясоў, склаліся пад уплывам навакольнага пейзажу. Лес выхаваў характар беларуса, калі чалавек і лес – родныя, і таму беларус любіць яго»,– пісаў У. Караткевіч у сваім творы «Зямля пад белымі крыламі».

А вось як піша пра лес у аповесці «Аблава» Васіль Быкаў: «Хведар павярнуў прэч ад гіблай мясціны і зноў пайшоў лесам. Прытаміўшыся, сеў пад тоўстым яловым камлем, аблітым белай смалой, патроху еў з шапкі журавіны, думаў. Усё ж як добра ў лесе на волі! Ніхто цябе нікуды не гоніць, ты не патрэбны нікому, як і ніхто не патрэбны табе. Каб так можна было пражыць жыццё! Зрэшты, калісь так і жылі: у хаўрусе з прыродай і лесам, знаходзячы ў ім і пракорм у галодныя гады, і прытулак у часы ліхалецця. Лес абараняў, лес саграваў душу і цела. Хто ж яшчэ большы быў дабрадзей для тутэйшага люду? Мусіць лепшага не было ніколі».

Лесу прысвяцілі свае творы Я. Купала, М. Багдановіч і Зоська Верас, а таксама сучасныя беларускія пісьменнікі.

Традыцыйныя ў фальклоры вобразы-сімвалы дубоў, якія нечым нагадваюць свяшчэнныя дрэвы, даволі часта выступаюць на першы план і ў літаратурных творах.

Часам ствараецца ўражанне, што перад намі не разгалісты, таўшчэзны лясны велікан, а чалавек, які мае тонкую чуллівую натуру і перажывае за ўсё, што адбываецца вакол яго; ён таксама радуецца і смяецца, плача і сумуе, а ў асобных выпадках здольны вылечваць людзей ад смутку і адзіноты, дапамагаць ім у час цяжкіх выпрабаванняў.

У творах беларускіх літаратараў ён набыў адметнасць, нацыянальную асаблівасць. Так, ласкавы *«дубок зяляненькі»*, які мы часта сустракаем у фальклорных творах, пачынае высвечваць новымі, раней нябачнымі гранямі.

Рысы бунтара надаў традыцыйнаму вобразу Якуб Колас. Спачатку дуб падаецца ў яго вершах і апавяданнях як звычайна пры апісанні прыроды: *«Лесу высокага шум-гул шчаслівы, песня магутных дубоў»* [«Родныя вобразы»]; *«Шпак на дубе расспяваўся»* [«Вясна»]; *«Таго дуба, што над рэчкай песціцца ў прыволлі»* [«Сохну марна ў астрозе»]. Тут дуб – звычайнае дрэва, без якога нельга ўявіць сабе беларускі пейзаж.

Сам пясняр, дзяцінства якога прайшло на ўлонні прыроды, у неабсяжных лясных прасторах, ніколі, нават у думках, не разлучаў сябе з лесам – сваім сябрам, *«дзе і сам жывеш супольна з жыццем хвояў і дубоў»* [«Гай»]. Пушча, бор у яго не бываюць адмоўнымі персанажамі.

Нельга знайсці ў творах пісьменніка лесу, які хоць неяк не спачуваў бы чалавеку. *«Дубы вячыстыя»* для яго – немалая падтрымка ў цяжкую хвіліну. Коласаўскі лес – гэта своеасаблівы сімвал імкнення да волі, свабоды, адлюстраванне прастораў беларускай зямлі. Персанажам зразумелыя галасы стыхійнага жыцця прыроды, і таму яны востра ўспрымаюць голас жыццёвых стыхій, чуюць іх музыку. Можа, менавіта таму, перачытваючы некаторыя раннія апавяданні пісьменніка, мы адчуваем водгаласы пакланення старажытнага чалавека свяшчэннаму дубу.

Здаецца, наша беларуская літаратура даўно павярнулася да той праблемы, якую з болем падкрэслівае С. Залыгін у наваміраўскім артыкуле «Літаратура і прырода»: «Літаратуры заўсёды самым блізкім бокам жыцця былі пакуты людзей. Трагедыя іх існавання на зямлі. На мой погляд, і культура ўзнікла менавіта тады, калі людзьмі была ўсвядомлена іх асабістая трагедыя. Крыніцай трагедыі заўсёды з'яўляліся адносіны паміж людзьмі – асабістыя настолькі моцна адлюстраваныя Шэкспірам, а ў рускай літаратуры Дастаеўскім, грамадскія; але вось у канцы дваццатага стагоддзя выявілася зусім іншая сфера, і прычынай глабальнай трагедыі – у адносінах паміж людзьмі і прыродай. І навізна, і нечаканасць гэтай трагедыйнасці застала літаратуру знянацку, зусім не падрыхтаванай да яе новай ролі. Літаратура ўсё яшчэ не ўспрыняла "праблемы прыроды" як безумоўна галоўную праблему сучаснага свету».

Вельмі шмат твораў беларускай літаратуры прысвечана Чарнобыльскай трагедыі. Мікола Мятліцкі аднойчы сказаў, што паэтам яго зрабіў Чарнобыль. Яго кнігі «Шлях чалавечы»і «Палескі смутак» – гэта памяць жывога жыцця на зямлі. Адным з першых адгукнуўся на чарнобыльскую трагедыю Р. Барадулін («Зажураны трыпціх»). Гэтай тэме прысвечаны творы А. Вялюгіна «Вясна трывогі нашай», М. Танка «Пасля аварыі», У. Някляева «Зона», С. Законнікава «Чорная быль». Увогуле, экалагічная тэма праходзіць праз усю творчасць В. Зуёнка. Цень атамнай катастрофы ляжыць амаль на ўсіх творах зборнікаў «Лета трывожных дажджоў», «Чорная лесвіца», «Пісьмы з гэтага свету». Калі вершы на экалагічную тэму В. Зуёнка 1960-х – першай паловы 1980-х гг. заклікалі чалавецтва апамятацца, нярэдка падказвалі шляхі выйсця, то для многіх пасьлячарнобыльскіх твораў характэрна сітуацыя бязвыходнасці, што сведчыць пра паглыбленне трагізму паэтавага светаадчування, пра перажыванне ім агульнай трагедыі як асабістай.

Аповесць В. Казько «Выратуй і памілуй нас, чорны Бусел» чытаецца на розных тэматычных узроўнях. Але сама назва твора гаворыць пра галоўную тэму – праблему ўзаемадачыненняў чалавека і навакольнага асяроддзя. У аповесці спачатку набліжаюцца, а затым і зліваюцца старажытны і цяперашні жыццёвыя часы. Жыхары 4 вёсак з экзатычнымі праславянскімі назвамі Белая Лужа, Залужжа, Казлялужжа і Лужа з'яўляюцца калгаснікамі «Вернага шляху», механізатарская праца складае толькі вонкавы пласт жыцця палешукоў: «жылі не ў калгасе, не з калгасам, не той нудотай, што нарачона была працай, а лесам, ракой, якія ў іх, слава Богу, захаваліся. Толькі дзякуючы таму ж лесу. Жылі ім мо і не ўсведамляючы. Але гэта было апошняе, што ў іх засталося запаветнае. Лес шмат ад чаго іх ратаваў, а больш за ўсё ад саміх сябе». Ці была калі-небудзь гармонія паміж чалавекам і акружаючым светам? Героі аповесці не памятаюць такога часу. Са скрухай гучыць гэтая думка ў казцы, што расказвае бабуля ўнуку. Дзеянне аповесці адбываецца ў сённяшні час, калі ідзе ўпартае супрацьстаянне прыроды агрэсіўнаму наступу з боку чалавека.

Пісьменнік-псіхолаг не даследуе прычыны, чаму героі яго дайшлі да такога жыцця, яго як бы не цікавіць паступовы рух чалавечай псіхікі ад прыроднай гармоніі – прыгажосці да таго, што вёскі «не вёскі, а братнія магілы… хаты праз адну крыж-накрыж забітыя дошкамі. Па ўсіх трох гэтых вёсках, падобна зданям ледзь перасоўваюць ногі яшчэ жывыя людзі, нягеглыя дзяды і бабулі, што ўжо самі не ведаюць на якім яны свеце, ці божы гэта свет, ці замагільнае царства».

Сённяшні чытач і без пісьменніка ведае вынікі экалагічнага бедства. Адчувае ён, што адбыліся змены ў горшы бок і ў прыродзе самога чалавека, галоўным чынам у яго душэўным жыцці. Ад літаратара чакаюцца і ў яго творах перш за ўсё шукаюцца адказы пісьменніцкія: дзе і ў чым прычыны – вытокі душэўных змен сучасніка.

Важнай асаблівасцю экалагічнай мастацкай літаратуры нашага часу з'яўляецца тое, што яна павінна быць больш чым раней «прыроднай». Размова ідзе не пра самастойную, вялікую па аб'ёме прысутнасць экалагічных вобразаў у творы, а пра пастаянную пісьменніцкую ўсвядомленасць у падтэксце сувязі чалавека і прыроды. Менавіта падобнае станаўленне да выкарыстання прыроды як сродку псіхалагічнага раскрыцця характараў у аповесці Алеся Жука «Праклятая любоў».

У навуковых працах усё часцей сталі сустракацца такія спалучэнні, як экалагічная этыка, экалагічная адказнасць, экалагічнае сумленне і мысленне, экалагічны ўзровень і г. д. Усё гэта сведчанне экалагізацыі грамадства. Ці трэба гаварыць пра актуальнасць падобных даследаванняў на матэрыяле мастацкай літаратуры?

Але пытанне паўстае рабром з другога боку. Як падрыхтаваны творцы мастацтва слова да такога павароту ў грамадскай думцы? Аналіз нашай бягучай прозы паказвае, што пакуль беларускія аўтары знаходзяцца ў вельмі няпростым становішчы ў вырашэнні праблемы «чалавек – прырода – характар». Яна мала усвядомлена імі як адна з самых важных. Прырода, пейзаж, экалагічны фон для сучаснай прозы – адзін са сродкаў псіхалагічнага майстэрства, вельмі другасны ў адносінах да апрабіраваных нібыта галоўных, вызначальных. А дарэмна. І ў першую чаргу па той прычыне, што літаратура ў гэтым выпадку страчвае, памяншае свае здольнасці адлюстравання.

Безумоўна, існуе паэтапнае асваенне, паступовае ўвядзенне ва ўжытак літаратуры новых прыёмаў (або больш правільна: удасканаленне старых). Умоўна можна засведчыць: наша проза ў тым, што тычыцца праблем экалогіі, знаходзіцца на этапе назваў шматлікіх праблем пры слабым мастацка-вобразным іх асэнсаванні. Дасягненняў, пэўных вынікаў, думаецца, трэба чакаць у празаікаў драматычна-трагічнага светапогляду ў адносінах да прыроды ў шырокім сэнсе гэтага слова (тлумачэнне – экалагічны крызіс). Што між тым не адмаўляе і «спакойнае», традыцыйнае апісальніцтва прыроды, шляхі могуць быць самыя розныя, але істотнай застаецца назаўсёды думка-пафас: дыяпазон узаемаадносін «характар – прырода» самы што ні ёсць шырокі. Вось і трэба ўлічваць усе нюансы псіхалагічных стасункаў, каб пашырыць і паглыбіць спасціжэнне, пазнанне чалавека ў жыцці і літаратуры.

Такім чынам, экалагічная тэма заўсёды займала адно з вядучых месцаў у беларускай літаратуры. Несумненна, творы беларускіх пісьменнікаў, якія прысвечаны роднай прыродзе, спрыяюць экалагічнаму выхаванню асобы. У БДТУ на занятках па беларускай мове шырока выкарыстоўваюцца сказы, пераклады, сачыненні па пачатку, матэрыял для якіх узяты з твораў беларускай літаратуры экалагічнай тэматыкі, разглядаюцца тэматычныя тэксты артыкулаў з часопісаў «Родная прырода», «Роднае слова», «Беларусь», «Беларуская думка», якія выпісваюцца на кафедры беларускай мовы. На лесагаспадарчым факультэце створаны экалагічны гурток «Крыніца», удзельнікі якога рыхтуюць навуковыя і творчыя працы экалагічнага напрамку. Усё гэта садзейнічае каштоўнай арыентацыі чалавека ў яго адносінах да прыроднага наваколля.

## Літаратура


1. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. – Мн., 1987.
2. Караткевіч У. «Зямля пад белымі крыламі». – Мн., 1977.
3. Старычонак В. Дз. «100 сачыненняў па беларускай літаратуры». – Мн.: Кніжны дом, 2004.
4. Адукацыя і выхаванне. – 2004, № 1.
5. Роднае слова. – 2004, № 11.
6. Роднае слова. – 2005, № 1.
7. Беларуская думка. – 2004, № 7.